Запішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і замяняючы выдзеленыя прыметнікі аднакаранёвымі прыметнікамі з суфіксамі ацэнкі.

Як паўплывала на змест тэксту замена прыметнікаў?

Праскланяйце назоўнік *сабака*.

**319.** Складзіце і запішыце невялікі тэкст — апісанне свойскай жывёлы з выкарыстаннем прыметнікаў з суфіксамі ацэнкі.

## *Гавары і пішы правільна*

Націск у прыметніках з суфіксамі ***-еньк-, -эньк-, -аньк-*** па́дае на той склад, што і ў прыметніках, ад якіх яны ўтвораны: *сла́бы* (пад націскам першы склад) — *сла́бенькі, малы́* (пад націскам другі склад) — *мале́нькі, малады́* (пад націскам трэці склад) — *маладзе́нькі*.

**320.** Запішыце сказы, утвараючы ад прыметнікаў, што ў дужках, прыметнікі з суфіксамі ***-еньк-, -эньк-, -аньк-***.

1. Маці падала мне заклеены *(белы)* канверт *(А. Бароўскі)*. 2. Пасыпаў *(дробны)*, *(густы)* сняжок *(Я. Колас)*. 3. Ля маладзіка скакала *(малая)* зорка, *(вострая)*, як іголачка *(І. Пташнікаў)*. 4. *(Нізкая)* паўразбураная хатка за высахлым садам нагадвала сабою пакінутую *(старую)* бабульку *(Л. Адамовіч)*. 5. Варушыся, гэй, не бойся, конік мой *(сівы)*! *(Я. Колас)*.

Пастаўце націск у прыметніках з суфіксамі ацэнкі.

## § 51. Прыметнікі з суфіксам *-ск-*, іх правапіс

**321.** Разгледзьце схемы.




Якой літарай (літарамі) у прыметніках, утвораных пры дапамозе суфікса ***-ск-***, перадаюцца спалучэнні зычных на стыку марфем: а) ***тс, кс, чс, цс***; б) ***дс, зс, жс, шс***?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Пры ўтварэнні прыметнікаў з дапамогай суфікса **-ск-** ад асноў назоўнікаў:

- зычныя ***т, к, ч, ц*** у спалучэнні з суфіксальным ***с*** перадаюцца літарай ***ц***: *брэсцкі, мастацкі, ткацкі, прыпяцкі*;
- зычныя ***д, з*** у спалучэнні з суфіксальным ***с*** перадаюцца як ***дс, зс***: *гарадскі, каўказскі*;
- зычныя ***ж, ш, г, к, х*** назоўнікаў, якія абазначаюць геаграфічныя назвы і назвы народаў, у спалучэнні з суфіксальным ***с*** перадаюцца як ***жс, шс, гс, кс, хс***: *парыжскі, латышскі, пецярбургскі, узбекскі, казахскі*;
- зычныя ***с, ш*** у спалучэнні з суфіксальным ***с*** перадаюцца адной літарай ***с***: *матроскі, таварыскі.*

**322.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі.

1. Кабылка, нібы чуючы лю*(ц/дс)*кую бяду, ірванула галопам *(В. Быкаў)*. 2. Нешта суровае, мужнае ёсць у разводзе каравула, у замёрлых салда*(ц/тс)*кіх постацях *(А. Жук)*. 3. Яна мела музычную адукацыю і добра валодала францу*(с/зс)*кай мовай *(А. Васілевіч)*. 4. Антось і Юзік любілі ўспамінаць рыба*(ц/кс)*кія прыгоды *(А. Камароўскі)*. 5. Васілёк ішоў услед за бабай па ўтаптанай сцежцы, між палосай бульбы і сусе*(ц/дс)*кім просам *(В. Хомчанка)*.

Растлумачце правапіс прыметнікаў.

**323.** Перабудуйце словазлучэнні «назоўнік + назоўнік» у словазлучэнні «адносны прыметнік + назоўнік». Запішыце.

Узор. *Шынель салдата — салдацкі шынель.*

Стол настаўніка, група турыстаў, горы Каўказа, гасціннасць узбекаў, будынак інстытута, вакзал Брэста, зубры Белавежы.

## *Гавары і пішы правільна*

Спалучэнне ***дс*** на стыку кораня і суфікса вымаўляецца як [ц]: *заводскі — заво*[**ц**]*кі, лідскі — лі*[**ц**]*кі.*

Спалучэнні ***зс, жс, шс*** вымаўляюцца як [с]: *каўказскі — каўка*[**с**]*кі, рыжскі — ры*[**с**]*кі, латышскі — латы*[**с**]*кі.*

**324.** Утварыце ад назваў беларускіх гарадоў прыметнікі — назвы раённых цэнтраў. Запішыце.

Узор. *Івацэвічы — Івацэвіцкі раён.*

Бялынічы, Добруш, Навагрудак, Баранавічы, Чашнікі, Слаўгарад, Ляхавічы, Ліда, Ушачы, Хойнікі, Нясвіж, Смалявічы.

Растлумачце правапіс зычных (спалучэнняў зычных) на стыку кораня і суфікса ў прыметніках.

У якіх з пералічаных гарадоў знаходзяцца знакамітыя замкі, што з'яўляюцца цэнтрамі турыстычных маршрутаў па Беларусі? Якія беларускія замкі вы наведвалі? Раскажыце, чым яны вас уразілі.

**325.** Прачытайце пары слоў.

студзе**нь** → студзе**нь**скі  
ліпе**нь** → ліпе**нь**скі  
ко**нь** → конскі  
Куба**нь** → кубанскі

На аснове прыкладаў сфармулюйце правіла правапісу мяккага знака перад суфіксам ***-ск-*** прыметнікаў, карыстаючыся наступнай схемай:

**Мяккі знак перад суфіксам *-ск-***

- пішацца, калі прыметнік утвораны ад назоўніка на ***-нь***, які абазначае …
- не пішацца, калі прыметнік утвораны ад назоўніка на ***-нь***, які не з'яўляецца назвай …

! Мяккі знак перад суфіксам ***-ск-*** пішацца ў прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў на ***-нь*** і ад назоўніка *восень*: *восеньскі, снежаньскі, чэрвеньскі* (у тым ліку і ў назве раёна — *Чэрвеньскі раён*). У іншых прыметніках мяккі знак пасля ***н*** перад ***-ск-*** не пішацца: *астраханскі, казанскі.*

**326.** Утварыце ад назоўнікаў прыметнікі пры дапамозе суфікса ***-ск-***. Складзіце з гэтымі прыметнікамі словазлучэнні і запішыце.

Студзень, ліпень, Хатынь, Кубань, Казань, Смаргонь.

Растлумачце правапіс мяккага знака або яго адсутнасць перад суфіксам ***-ск-*** прыметнікаў.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**327.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы асноўную думку тэксту.

Адзін з самых каларытных рэгіёнаў Беларусі — Чэрвеньскі раён.

Чэрвень — радзіма касманаўта Алега Навіцкага, які 4 разы пабываў на Міжнароднай касмічнай станцыі. У гарадской школе № 2, дзе ён вучыўся, арганізаваны музей касманаўтыкі.

У 1819 годзе ў вёсцы Убель нарадзіўся кампазітар і дырыжор Станіслаў Манюшка. А восеньскімі днямі 2017 года ў Смілавічах адкрылася музычная гасцёўня імя вялікага кампазітара. Тут праводзяцца творчыя вечарыны[сл], у якіх прымаюць удзел выхаванцы дзіцячых мастацкіх школ раёна.

У Смілавічах дзейнічае адзінае ў краіне прадпрыемства па вырабе валёнак. Слава пра смілавіцкія валёнкі ходзіць па ўсім свеце *(Паводле А. Навахроста)*.

***рэгіён***

Выпішыце з тэксту прыметнікі, утвораныя пры дапамозе суфікса ***-ск-***. Растлумачце іх правапіс.

Вызначце тып тэксту. Якая кампазіцыйная частка ў ім прапушчана? Дапоўніце тэкст гэтай часткай. Запішыце яе.

Раскажыце пра тое, якімі людзьмі, прадпрыемствамі, мясцінамі славіцца ваша малая радзіма. Уявіце, што вам прапанавалі прыняць удзел у фотаконкурсе «Вялікія справы маёй малой радзімы». Які фотаздымак вы зрабілі б? Вусна апішыце яго.

## § 52. Правапіс *-н-*, *-нн-* у прыметніках

**328.** Разгледзьце схему. Якім спосабам утвораны прыметнікі *лімонны*, *раённы*, *туманны*?

*лімон* + -н- = *лімонны*
*раён* + -н- = *раённы*
*туман* + -н- = *туманны*

На які гук заканчваюцца асновы назоўнікаў, ад якіх утвораны прыметнікі *лімонны*, *раённы*, *туманны*?

Абапіраючыся на схему, сфармулюйце правіла правапісу ***-нн-*** у прыметніках.